Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка)*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01 Беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2012

## Складальнік

*Г. М. Друк,* дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

## Рэцэнзенты:

*кафедра* беларускай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»;

*Л. В. Алейнік,* дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

## Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 25.06.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 11.10.2011 г.);

*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 12.10.2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. В. Каташвілі*
Адказны за выпуск *Г. М. Друк*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Тэорыя літаратуры» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)».

Прафесія бібліятэкара, настаўніка вымагае добрага ведання мастацкай славеснай творчасці, таму ўзнікае неабходнасць вывучэння тэорыі літаратуры, якая, з'яўляючыся важнейшай часткай літаратуразнаўства, характарызуе сутнасць, прызначэнне, асаблівасці зместу і формы літаратуры як мастацтва слова, падагульняе вопыт развіцця сусветнага і айчыннага прыгожага пісьменства. З гэтай нагоды дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» заўсёды застаецца актуальнай як прадмет вывучэння ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Тэорыя літаратуры – адкрытая навуковая дысцыпліна, якая падтрымлівае цесную сувязь з гісторыяй беларускай літаратуры, філасофіяй і некаторымі іншымі навукамі. Дысцыпліна структуравана па раздзелах і тэмах, якія ўяўляюць адносна самастойныя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца на набытыя раней студэнтамі веды пры вывучэнні «Гісторыі беларускай літаратуры».

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» арыентавана на разуменне твора і творчасці як асаблівай мастацкай рэальнасці, у якой выяўлена асоба пісьменніка. Выкладанне курса мае на *мэце* павышаць эстэтычную патрабавальнасць будучых бібліятэкараў і настаўнікаў у ацэнцы літаратурных з'яў. У сувязі з пастаўленай мэтай вырашаюцца наступныя *задачы:*

– вызначэнне месца тэорыі літаратуры ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў і настаўнікаў;

– распрацоўка сістэмы тэарэтычных паняццяў і катэгорый для характарыстыкі асноўных з'яў і формаў літаратурнай творчасці з улікам навейшых дасягненняў літаратуразнаўства;

– паглыбленне і сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як форму эстэтычнага асваення рэчаіснасці пісьменнікам;

– знаёмства з асновамі навуковага аналізу мастацкага твора і вылучэнне найбольш актуальных праблем выкладання літаратуры ў школе;

– фарміраванне навыкаў самастойнага даследавання мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па завяршэнні курса студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыю літаратуразнаўства як навукі;

– асноўныя тэрміналагічныя комплексы, паняцці, якімі аперырує літаратуразнаўства;

– крытэрыі мастацкасці літаратурнага твора;

– прынцыпы навуковага аналізу літаратурнага твора;

*умець:*

– дакладна і ясна, аргументавана раскрываць змест тэрміналагічных паняццяў;

– класіфікаваць літаратурныя творы паводле жанравай спецыфікі, творчага метаду, адрозніваць літаратурна-мастацкія метады, стылі і кірункі;

– аналізаваць мастацкі твор у адзінстве зместу і формы, канцэптуальна, на ўсіх узроўнях;

– выкарыстоўваць тэрміналагічны апарат пры выкладанні літаратуры ў школе;

– свабодна валодаць тэрміналогіяй пры складанні бібліяграфічных спісаў, каталогаў, картатэк.

Змест курса складае разгляд у тэарэтычным аспекце важнейшых з'яў з гісторыі развіцця мастацтва слова, асаблівасцей узнікнення і эвалюцыі паняццяў, якімі аперырує тэорыя літаратуры. Асноўнымі метадамі навучання з'яўляюцца праблемнае выкладанне, эўрыстычны, гістарычны і інш.

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння дысцыпліны рэкамендуецца раўнамерна размеркаваць самастойную работу студэнтаў і кантроль за засваеннем праграмнага зместу. Формы кантролю для праверкі ведаў тэарэтычнага плана – тэсты, тэрміналагічны дыктант, разгадванне красвордаў і інш. Па авалоданні навыкамі філалагічнага аналізу варта арганізаваць работу на занятках так, каб студэнты вучыліся аналізаваць тэксты пад кіраўніцтвам выкладчыка. Замацаванне атрыманых ведаў і навыкаў адбываецца самастойна па-за аўдыторыяй падчас працы з іншымі мастацкімі творамі. Рэкамендуецца таксама практыкаваць складанне слоўнікаў, ствараць вусныя ці пісьмовыя тэксты.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» ўсяго адведзена 110 гадзін, з якіх 66 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 40, семінарскія заняткі – 26. Вывучэнне курса рэкамендавана завяршаць залікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | лекц. | семін. |
| **Уводзіны** | 1 | 1 | |
| **Раздзел I. Тэорыя літаратуры ў сістэме літаратуразнаўства** | | | |
| Тэма 1. Літаратуразнаўства як навука: агульнае паняцце | 1 | 1 | |
| Тэма 2. Гісторыя станаўлення і развіцця тэарэтыка-літаратурнай думкі | 2 | 2 | |
| **Раздзел II. Літаратура як від мастацтва** | | | |
| Тэма 3. Спецыфіка літаратуры як віду мастацтва | 2 | 2 | |
| Тэма 4. Літаратура як мастацтва слова. Асаблівасці мовы мастацкіх твораў | 2 | 2 | |
| Тэма 5. Празаічная і вершаваная мовы ў мастацкай літаратуры | 2 | | 2 |
| Тэма 6. Асновы вершаскладання | 4 | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Літаратурныя роды, віды, жанры** | | | |
| Тэма 7. Літаратурныя роды, віды, жанры (агульнае паняцце) | 2 | 2 | |
| Тэма 8. Эпас, яго віды і жанры | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 9. Лірыка. Віды і жанры лірыкі | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 10. Драма як літаратурны род. Драматычныя жанры | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 11. Мастацкія формы са змешанымі родавымі і жанравымі прыкметамі | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Тэорыя літаратурнага працэсу** | | | |
| Тэма 12. Літаратурны працэс: агульнае паняцце | 4 | 4 | |
| Тэма 13. Сістэма літаратурна-мастацкіх стыляў і напрамкаў | 14 | 8 | 6 |
| **Раздзел V. Творчы працэс і мастацкі твор** | | | |
| Тэма 14. Творчы працэс | 2 | 2 | |
| Тэма 15. Змест і форма літаратурнага твора | 6 | | 6 |
| Тэма 16. Стыль | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 17. Аналіз літаратурнага твора | 4 | 2 | 2 |
| Тэма 18. Літаратуразнаўчыя метады. Асноўныя напрамкі і школы ў літаратуразнаўстве | 2 | 2 | |
| Усяго | 66 | 40 | 26 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *Уводзіны*

Месца дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з іншымі дысцыплінамі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Формы кантролю.

## Раздзел I. ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў СІСТЭМЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

### *Т э м а 1. Літаратуразнаўства як навука: агульнае паняцце*

Літаратуразнаўства як тэарэтычнае паняцце, гісторыя тэрміна. Дзве канцэпцыі літаратуразнаўства – як навукі пра сутнасць і развіццё літаратурна-мастацкай творчасці і як кааперацыі розных відаў літаратуразнаўчай дзейнасці (навукова-даследчай, тэксталагічнай, адукацыйнай і інш.). Апорныя, базісныя (гісторыя і тэорыя літаратуры, літаратурная крытыка), і дапаможныя (гістарыяграфія, тэксталогія, бібліяграфія, архівазнаўства і інш.) дысцыпліны літаратуразнаўства.

Тэорыя літаратуры як адна з галін літаратуразнаўства, спецыфіка тэарэтыка-літаратурнай думкі. Прадмет і змест, структура дысцыпліны «Тэорыя літаратуры».

### *Т э м а 2. Гісторыя станаўлення і развіцця тэарэтыка-літаратурнай думкі*

Сінкрэтычны характар ведаў пра літаратуру ў глыбокай старажытнасці. Распрацоўка тэорыі мастацтва і літаратуры ў Антычную эпоху (Платон, Арыстоцель, Гарацый). Літаратурная думка ў Сярэднія вякі (Ф. Аквінскі і інш.). Пытанні літаратуры ў трактатах эпохі Адраджэння (А. Дантэ, Т. Таса, І. Ю. Скалігер, інш.). Першыя буйныя тэарэтыкі эпохі класіцызму (Ф. Малерб, М. Буало і інш.). Уклад французскіх асветнікаў (Д. Дзідро, Ж.-Ж. Русо) у развіццё тэорыі літаратуры. Уплыў тэорый І. Канта, І. Фіхтэ, Ф. Шэлінга, Г. Гегеля на развіццё еўрапейскай эстэтычнай і тэарэтыка-літаратурнай думкі канца XVIII – пачатку XIX ст.

Вытокі і гісторыя рускага літаратуразнаўства (М. Ламаносаў, В. Бялінскі, М. Дабралюбаў, М. Чарнышэўскі, інш.).

Стан тэарэтычнага літаратуразнаўства ў Беларусі. Зараджэнне (трактат візантыйскага пісьменніка Г. Херабоска «О образех» у «Изборнику» 1073 г.) і развіццё тэарэтычнага досведу ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эпоху Адраджэння і барока (Ф. Скарына, Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, М. Сарбеўскі). Беларускае літаратуразнаўства XIX ст. (Р. Друцкі-Падбярэзскі, А. Кіркор, У. Сыракомля, інш.). Літаратурна-крытычныя і тэарэтычныя даследаванні пісьменнікаў нашаніўскага перыяду (С. Палуяна, М. Багдановіча, Л. Гмырака, М. Гарэцкага), 1920–30-х гг. XX ст. (І. Замоціна, А. Бабарэкі, Я. Пушчы, інш.). Пасляваеннае і сучаснае беларускае літаратуразнаўства. Вядучыя беларускія вучоныя-літаратуразнаўцы 1950–90-х гг. (А. Адамовіч, Дз. Бугаёў, М. Мушынскі, В. Каваленка, А. Мальдзіс, В. Рагойша, інш.), іх найбольш значныя працы.

## Раздзел II. ЛІТАРАТУРА ЯК ВІД МАСТАЦТВА

### *Т э м а 3. Спецыфіка літаратуры як віду мастацтва*

Мастацкая творчасць як асаблівая галіна дзейнасці чалавека. Тэорыя мастацкага вобраза як тыпу мыслення і спосабу перадачы спецыфічна мастацкай інфармацыі. Вобраз і знак. Умоўнасць як сродак вобразнага выражэння, паняцце жыццёвай і мастацкай праўды. Тыповае, канкрэтнае, індывідуальнае ў мастацкім вобразе. Адзінства пачуццёвага і інтэлектуальнага пачаткаў у вобразе, цэласнасць мастацкага вобраза.

Літаратура і міф, характар узаемаадносін. Паняцце пра вобраз-архетып. Роля і месца міфа ў сучаснай літаратуры. Нацыянальныя літаратурныя архетыпы.

Літаратура і навука. Духоўна-эстэтычны змест чалавечага быцця ў канкрэтных і непаўторных, індывідуальных формах у літаратуры і мастацтве. Літаратура як інтэлектуальна-творчая дзейнасць.

Літаратура ў сістэме мастацтва. Найбольш распаўсюджаныя віды мастацтва, іх вызначальныя ўнутрывідавыя адзнакі і рысы. Дыферэнцыяцыя мастацтва ў Антычнасці. Прынцыпы класіфікацыі мастацтваў на сучасны момант. Дыскусіі аб прызначэнні мастацтва ў канцы XX ст. Канцэпцыя крызісу мастацтва.

Мастацтва і літаратура ў суаднесенасці з іншымі формамі культуры. Вылучэнне вобраза-топаса як культурна-тыпалагічнай семіятычнай адзінкі, характэрнай для нацыянальнай культуры.

Літаратура і жыццё. Мастацкая літаратура і фарміраванне грамадскай свядомасці, формы іх узаемадзеяння. Асноўныя функцыі мастацкай літаратуры. Значэнне літаратуры і мастац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тва для працэсу духоўнага ўдасканалення асобы і стварэння духоўнага клімату ў грамадстве.

### *Т э м а 4. Літаратура як мастацтва слова. Асаблівасці мовы мастацкіх твораў*

Слова як унікальны інструмент для ўвасаблення творчай задумы ў адпаведнай мастацкай форме і як прадмет, вобразатвор, у свеце мастацкага тэксту. Узаемадзеянне ў мастацкіх тэкстах літаратурнай мовы і гутарковага маўлення. З'ява мастацкай паліфаніі. Мастацкая літаратура – захавальніца нацыянальных скарбаў мовы.

Вобразнасць, іншасказальнасць, экспрэсіўнасць і аўтарская арыгінальнасць як галоўныя прыкметы мовы мастацкіх твораў.

Лексічныя і фразеалагічныя сродкі вобразнасці і мастацкай выразнасці: сінонімы, амонімы, антонімы, фразеалагізмы і іншыя моўныя элементы з пласта агульнаўжывальнай лексікі. Спецыфічная лексіка ў мове твораў мастацкай літаратуры (архаізмы, гістарызмы, жарганізмы, вульгарызмы, прафесіяналізмы, інш.). Спецыяльныя выяўленчыя сродкі мовы, або тропы (эпітэт, параўнанне, метафара, алегорыя, сімвал і інш.). Выкарыстанне пісьменнікамі інтанацыйна-сінтаксічных сродкаў мовы (інверсія, паўтор, градацыя, паралелізм, абрыў, пропуск, эліпсіс і інш.). Гукавая арганізацыя мовы (гукаперайманне, алітэрацыя, асананс).

Няаўтарскае слова ў мастацкім творы: эпіграф, цытата, рэмінісцэнцыя, алюзія, інтэртэкстуальнасць.

### *Т э м а 5. Празаічная і вершаваная мовы ў мастацкай літаратуры*

Мова аўтара як крытэрый культуры пісьма, эстэтычнага густу творцы, яго жыццёвага досведу. Беларускія пісьменнікі (Я. Колас, Я. Купала, К. Чорны, У. Караткевіч, Р. Барадулін, Я. Янішчыц, А. Разанаў) пра слова і яго гучанне, асацыятыўныя сувязі, гістарычныя карані і інш.

Мова прозы. Вобраз апавядальніка ў творы і асноўныя формы аповеду. Асаблівасці мовы дзеючых асоб у складзе празаічнай мовы. Простая мова і яе разнавіднасці. Паняцце рытмічнай прозы.

Адметнасці вершаванай мовы: асаблівая роля рытму і фанетыкі, эмацыянальна-экспрэсіўны пачатак, яркая вобразнасць і выразнасць, лаканізм. Знешнія прыкметы вершаванай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(рыфма, страфа, даўжыня радка). «Празаізацыя» вершаванай мовы. Функцыі рыфмы ў вершаванай мове, віды рыфмоўкі.

Страфа: спосабы ўтварэння, тыпалогія, класіфікацыя.

### *Т э м а 6. Асновы вершаскладання*

Вершаваная сістэма як своеасаблівае паўтарэнне рытмастваральных элементаў, іх сувязь з іншымі кампанентамі мастацкага твора.

Характарыстыка рытмастваральных элементаў антычнага вершаскладання; яго уплыў на вершаваныя формы еўрапейскіх літаратур, у тым ліку і беларускай («Песня пра зубра» М. Гусоўскага, «Пруская вайна» Я. Вісліцкага, «З Авідзія. Ікар і Дзедал» М. Багдановіча, пентаметры і гекзаметры ў творчасці У. Жылкі, М. Танка, інш.).

Сутнасць і прынцыпы сілабічнага вершаскладання. Сілабічны верш у беларускай літаратуры (Ф. Скарына, С. Полацкі, Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, інш.).

Народнае (танічнае) вершаскладанне і яго асаблівасці. Танічны верш у паэзіі Я. Купалы («Бандароўна», «Тарасова доля»), М. Багдановіча («Страцім-лебедзь»), М. Чарота («Босыя на вогнішчы»). Прыёмы танічнага верша ў творчасці М. Танка, П. Панчанкі, Р. Барадуліна, інш.

Асаблівасці сілаба-танічнага вершаскладання, асноўныя памеры і стопы. Метр, метрычны малюнак, вершаваны памер: азначэнні паняццяў. Зараджэнне і развіццё сілаба-тонікі ў Беларусі (Я. Лучына, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч. А. Гарун, У. Караткевіч, А. Пысін, інш.).

Пераходныя і змешаныя формы верша (белы верш, дольнік, верш у прозе, інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. ЛІТАРАТУРНЫЯ РОДЫ, ВІДЫ, ЖАНРЫ

### *Т э м а 7. Літаратурныя роды, віды, жанры (агульнае паняцце)*

Сістэматызацыя і класіфікацыя твораў у залежнасці ад іх структуры, моўнай арганізацыі, мастацкага зместу. Вылучэнне літаратурнага роду (агульнага) як катэгорыі вышэйшага парадку, літаратурнага віду як катэгорыі сярэдняга парадку, разнавіднасці жанру як катэгорыі ніжэйшага парадку. Эпас, лірыка і драма як асноўныя літаратурныя роды.

Праблема класіфікацыі літаратурных родаў у сучаснай навуцы («трыяда» як непрыдатная для ахопу ўсёй шматстайнасці твораў, вылучэнне міжродавых формаў, формаў па-за «трыядай»: нарыса, эсэ, асобных жанраў постмадэрнізму). Паняцце віду як устойлівага тыпу твораў з аднолькавай структурай; сучаснае навуковае стаўленне да гэтага тэрміна.

Жанравая спецыфіка літаратуры Антычнага свету і Сярэднявечча. Станаўленне і развіццё жанравай структуры новай літаратуры. Класічны жанр. Гістарычная эвалюцыя жанраў. Метамарфозы жанру, іх якаснае відазмяненне (паэмы А. Разанава). Унікальныя жанравыя формы ў нацыянальнай літаратуры («Казкі жыцця» Я. Коласа, «Абразкі» З. Бядулі, «Скарбы жыцця» М. Гарэцкага, вершы-шаснаццаціradкоўі А. Куляшова, прыпавесці В. Быкава, жанравыя эксперыменты А. Разанава).

### *Т э м а 8. Эпас, яго віды і жанры*

Асноўныя родавыя адзнакі эпасу, вылучэнне трох структурных формаў эпасу: малой, сярэдняй, вялікай. Эпапея («Махабхарата», «Рамаяна», «Іліяда» і «Адысея», інш.), вызначэнне структуры, зместу і сутнасці жанру. Эпапейныя элементы ў эпічных творах Новага часу («Вайна і мір», «Ціхі Дон», «Векапомныя дні», «Палеская хроніка», інш.).

Эпічная паэма (паэма-эпапея): азначэнне тэрміна, узнікненне жанру, этапы развіцця. Разнавіднасці паэмы.

Спецыфіка жанравай прыроды рамана. Класіфікацыя рамана паводле сюжэтабудовы, моўнай арганізацыі, тэматыкі, формы аповеду. Гісторыя станаўлення і развіцця еўрапейскага і сусветнага рамана. Беларускі раман і яго жанравыя формы ў літаратуры канца XX ст.

Аповесць і яе месца ў іерархіі жанраў. Беларуская аповесць і гісторыя яе развіцця, жанравыя разнавіднасці. «Быкаўская» аповесць.

Апавяданне як малая эпічная форма і яе спецыфічныя рысы. Адметнасць навелы. Эвалюцыя жанру апавядання і навелы ў беларускай літаратуры. Мастацкія формы апавядання ў айчыннай літаратуры канца XX – пачатку XXI ст. з элементамі ўмоўнасці і іх характарыстыка.

Байка, яе вызначальныя жанравыя асаблівасці. Вытокі і гісторыя развіцця байкі ў еўрапейскай і беларускай літаратуры.

Жанры мастацка-біяграфічнай прозы (мемуары, дзённік і эпісталярый і інш.), іх роля ў сучасным літаратурным працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жанры масавай літаратуры. Фэнтэзі і яго характарыстыка. Коміксы, дайджэсты, трылеры і інш.

### *Т э м а 9. Лірыка. Віды і жанры лірыкі*

Прадмет адлюстравання ў лірыцы, паняцце «лірызму» ў мастацкім творы. Асноўныя родавыя прыкметы. Лірычны герой і асоба аўтара, асаблівасці ўзаемадачынення. Паняцце «аўтапсіхалагічнай» лірыкі. Дыферэнцыяцыя лірыкі паводле пафасу, стылю, тэматыкі.

Класічныя лірычныя жанры: ода, дыфірамб, пасланне, элегія, стансы, раманс, эпіграма, эклога, эпіталама, эпітафія, рэквіем, мадрыгал, санет, трыялет, рандо, рандэль і некаторыя інш.; іх гістарычная эвалюцыя.

Лірычная паэма і яе месца ў беларускай літаратуры.

Вытокі жанру балады і гісторыя яе развіцця. Сучасная трактоўка балады як складанага жанравага ўтварэння, сінтэзу лірычнага, эпічнага і драматычнага пачаткаў. Баладны жанр у творчасці Я. Купалы, У. Караткевіча, Я. Сіпакова, інш.

Адметнасць верлібра як літаратурнага жанру.

Асноўныя жанры ў сучаснай беларускай паэзіі і іх спецыфіка: хоку і танку, акраверш, паліндром, айрэн, газель, актава, лімэрык, інш. (на прыкладзе творчасці Р. Барадуліна, Я. Янішчыц, Э. Акуліна, А. Хадановіча, інш.). Аўтарскія паэтычныя жанры: пункціры, вершаказы, версэты, квантэмы і зномы А. Разанава.

### *Т э м а 10. Драма як літаратурны род. Драматычныя жанры*

Драма як уласна літаратурная і тэатральная з’ява. Месца і роля аўтара ў драматычным творы. Спецыфічныя рысы драматычных твораў. Вытокі і развіццё драматургіі на Беларусі.

Трагедыя як жанр. Антычная трагедыя. Асаблівасці рэнесанснай і класіцыстычнай трагедыі. Сутнасць трагічнага канфлікту. Выцясненне трагедыі драмай.

Паэтыка драмы. Драма ў еўрапейскай і сусветнай літаратуры. «Драма абсурду». Кароткая характарыстыка развіцця жанру драмы ў беларускай літаратуры.

Камедыя ў сістэме драматычных жанраў, яе асаблівасці. Спецыфіка канфлікту, адметнасць раскрыцця характараў. Жанравыя камедыйныя формы. Гісторыя развіцця еўрапейскай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай камедыі. Беларуская камедыя, яе жанравыя формы, найбольш характэрныя асаблівасці развіцця.

Драматычныя жанры ў сучаснай літаратуры: гістарычная драма і трагедыя, п'еса-казка, камедыя-фарс і інш. Эксперыменты ў беларускай драматургіі канца XX ст. (І. Сідарук, М. Арахоўскі, Г. Багданава, інш.). З'ява рымейку (творчасць С. Кавалёва).

### *Т э м а 11. Мастацкія формы са змешанымі родавымі і жанравымі прыкметамі*

Пранікненне драматычных, лірычных, эпічных элементаў у любы з літаратурных родаў і жанраў. Традыцыя вылучэння ліра-эпасу ў тэорыі літаратуры.

Жанравыя формы паэмы: ліра-эпічная, ліра-драматычная, эпічна-драматычная, ліра-эпічна-драматычная і інш.

Драматызаваная проза.

Лірычная проза.

Трагікамедыя і яе асаблівасці.

Прыклады жанравай дыфузіі ў беларускай літаратуры.

## Раздзел IV. ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

### *Т э м а 12. Літаратурны працэс: агульнае паняцце*

Значэнне тэрміна «літаратурны працэс». Фактары, якія абумоўліваюць літаратурны працэс. Асноўныя тэрміны для характарыстыкі літаратурнага развіцця: мастацкая сістэма, творчы метад, літаратурны напрамак, плынь, стыль; праблема іх тэарэтычнага прымянення.

Перыядызацыя сусветнага і нацыянальнага літаратурнага працэсу: асноўныя этапы, літаратурна-культурныя эпохі. Паняцце пра стадыяльнасць развіцця літаратуры.

Праблема пераемнасці і абнаўлення, традыцый і наватарства. Літаратурныя ўплывы, запазычанні. Кантактныя і генетычныя, тыпалагічныя сувязі літаратуры.

Гістарычнае, рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры. Спецыфіка развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства ў літаратурна-тэарэтычных працах М. Багдановіча, М. Гарэцкага, В. Каваленкі, А. Адамовіча, інш. Праблема паскоранасці развіцця.

Літаратурная класіка – нацыянальная і сусветная. Фактары, якія вызначаюць рэпутацыю твораў у якасці класічных. Белет-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстыка. Масавая літаратура. Пытанне духоўнасці і камерцыйнае мастацтва.

### *Т э м а 13. Сістэма літаратурна-мастацкіх стыляў і напрамкаў*

Характэрныя рысы антычнай літаратуры. Сярэдневяковая літаратура, асноўныя мастацкія жанры. Асаблівасці рэнесанснай літаратуры. «Гратэскны рэалізм» (М. Бахцін) як форма мастацкай творчасці ў эпоху Адраджэння. Храналагічныя рамкі барока, сацыяльна-гістарычныя і эстэтыка-культурныя прычыны і ўмовы яго ўзнікнення. Рысы літаратурнага барока. Класіцызм: эстэтычная праграма і яе тэарэтыкі. Паэтыка класіцызму, яго жанравая сістэма. Класіцызм і беларуская літаратура. Асветніцтва і сентыменталізм: храналагічныя рамкі, жанравая сістэма. Праявы сентыменталізму ў асобных беларускіх пісьменнікаў.

Станаўленне і развіццё рамантызму ў сусветнай і беларускай літаратуры, асноўныя этапы, галоўныя прыкметы рамантызму. Сістэма літаратурных прыёмаў, жанраў. Паняцце пра неарамантызм. Рэалізм і яго сутнасць, асноўныя этапы развіцця. Спецыфіка зараджэння і развіцця рэалізму на Беларусі. «Магічны рэалізм» (М. Булгакаў, Г. Маркес, В. Казько). Натуралізм; яго праявы ў асобных творах М. Зарэцкага.

Мадэрнізм як філасофска-эстэтычны рух. Характарыстыка акмеізму, імажынізму, сімвалізму, экспрэсіянізму, экзістэнцыялізму, імпрэсіянізму і інш. у дачыненні да беларускай літаратуры (на матэрыяле творчасці Я. Купалы, З. Бядулі, М. Багдановіча, Я. Пушчы, М. Чарота, К. Чорнага, В. Быкава, інш.). З'ява постмадэрнізму, яго сутнасць і эстэтычныя прынцыпы. Своеасаблівасць выяўлення постмадэрнізму ў нацыянальнай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V. ТВОРЧЫ ПРАЦЭС І МАСТАЦКІ ТВОР

### *Т э м а 14. Творчы працэс*

Творчы працэс, яго непаўторна-індывідуальны, інтуітыўны і інтымны характар. Фактары, якія абумоўліваюць творчы працэс (талент, жыццёвы вопыт, натхненне, інтуіцыя, інш.). Арыгінальнасць аўтарскай канцэпцыі асобы і свету як адзін з эстэтычных крытэрыяў.

Характарыстыка асноўных этапаў творчага працэсу. Беларускія пісьменнікі-класікі пра сутнасць мастацкай дзейнасці і творчага працэсу (М. Багдановіч, Я. Колас, А. Куляшоў, М. Танк, М. Стральцоў, Я. Янішчыц, А. Разанаў, інш.).

Адлюстраванне індывідуальна-мастацкага светапогляду ў канкрэтных тыпах эмацыянальнасці (гераічным, трагічным, камічным, рамантычным, міфалагічным, інш.). Вызначэнне катэгорыі мастацкага пафасу. Мастацкі тып эмацыянальнасці (пафас) – аснова пэўнага віду тыпізацыі.

Аўтар, герой, чытач і «вялікі дыялог» у мастацкім творы. Аўтар (ад лац. – «суб’ект дзеяння») у сферы тэорыі мастацтва: рэальная асоба з індывідуальным характарам і ўласнай біяграфіяй; вобраз аўтара; суб’ект творчай дзейнасці (творца). Формы аўтарскай прысутнасці ў мастацкім творы. Канцэпцыя смерці аўтара ў тэорыі літаратуры XX ст.

### *Т э м а 15. Змест і форма літаратурнага твора*

Літаратурны твор як цэласная мастацкая сістэма са складанай, многаўзроўневай структурай і адзінай творчай задумай.

Тэма (тэматыка) твора. «Вечныя» тэмы ў мастацтве. Праблема (праблематыка). Ідэя (ідэйны змест). Канфлікт і калізія. Тыпы канфліктаў паводле асаблівасцей дзеяння, характару супярэчнасцей паміж персанажамі. Характар і значэнне канфлікту ў развіцці дзеяння ў творах лірычнага, эпічнага і драматычнага плана. Тэорыя «бесканфліктнасці».

Размежаванне паняццяў «персанаж», «герой», «дзеючая асоба». Цэнтральныя, другарадныя, эпізадычныя персанажы. Сродкі стварэння і раскрыцця характару персанажа ў творы. Вобраз-характар і вобраз-тып, іх адрозненні. Эпічныя, лірычныя і драматычныя характары, асаблівасці іх раскрыцця ў творах.

Сюжэт і фабула. Састаўныя часткі сюжэта. Тыпы сюжэтаў у залежнасці ад характару развіцця дзеяння, яго зместу і інш. Пазасюжэтныя элементы. З’ява «сюжэтнага развалу» ў сучаснай літаратуры. «Вандроўныя», «блукаючыя» сюжэты.

Кампазіцыя і архітэктоніка твора. Тыпы кампазіцыі ў эпічных і лірычных творах. Традыцыйныя спосабы пабудовы твора і пашыраныя ў сучасных творах сюжэтна-кампазіцыйныя прыёмы.

Паняцце пра хранатоп мастацкага твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Т э м а 16. Стыль*

Гісторыя фарміравання катэгорыі стылю; шматзначнасць тэрміна. Лінгвістычнае і літаратуразнаўчае разуменне стылю.

Стыль твора як эстэтычнае адзінства ўсіх кампанентаў вобразна-экспрэсіўнай формы, абумоўленае скіраванасцю на раскрыццё і ўвасабленне цэласнасці мастацкага зместу, яго гарманічнай завершанасці.

Літаратурна-мастацкі стыль як працэс, які здольны да эвалюцыі. Фактары, ад якіх залежыць стыль: жанравая прырода твора, індывідуальны чалавечы характар і тэмперамент, светапогляд, талент, сацыяльна-гістарычныя ўмовы, мастацкі метад. Стыль як пазіцыя пісьменніка і форма праяўлення яго творчай індывідуальнасці. Творчасць Я. Коласа – энцыклапедыя сродкаў моўнай арганізацыі твора. Стылізацыя і пародыя ў літаратуры. Дамінанты індывідуальнага стылю пісьменніка (напрыклад, апісальнасць і дэталізаванасць у творах І. Пташнікава, сюжэтнасць (фабульнасць) твораў І. Шамякіна, міфалагізм прозы В. Казько, аналітычнасць В. Быкава, інш.).

### *Т э м а 17. Аналіз літаратурнага твора*

Навуковы літаратуразнаўчы аналіз і праблема школьнага аналізу мастацкага твора. Пошук канкрэтнага аналітычнага шляху, які найбольш падыходзіць да аналізу пэўнага мастацкага твора ці творчасці пісьменніка.

Прынцыпы навуковага разгляду твора. Эстэтычны падыход і яго сутнасць: выяўленне зместу і вобразнай канцэпцыі асобы, а таксама спосабаў увасаблення ідэйнай задумы ў жанры і стылістыцы твора, яго сюжэтна-кампазіцыйнай структуры і вобразнай сістэме. Захаванне гістарычнага прынцыпу, які прадугледжвае аналіз твора ў сувязі з сацыякультурнымі ўмовамі, ва ўзаемадачыненні з такімі ж літаратурнымі з’явамі ў іх развіцці. Неабходнасць вывучэння твора як сістэмы, якая ўяўляе сабой складанае ўзаемападпарадкаванне асобных кампанентаў і якая ўключаецца ў сістэмы больш высокага парадку: творчасць пісьменніка, нацыянальная літаратура, грамадская свядомасць і інш. Аналіз і высновы – інтэрпрэтацыя твора.

Крытэрыі мастацкасці літаратурнага твора. Актуальнасць зместу і яго адпаведнасць форме. Моўнае майстэрства пісьменніка – абавязковая прыкмета мастацкасці літаратурнага твора. Сутнасць эстэтычнага ідэалу аўтара. Арыгінальнасць і непаўторнасць мастацкай канцэпцыі асобы і свету. Глыбіня мастац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіх абагульненняў і спецыфіка мастацкай тыпізацыі ў творы. Месца нацыянальнага фактару ў раскрыцці характараў і жыцця грамадства. Гістарызм і народнасць. Гуманізм аўтарскай пазіцыі як адно з асноўных патрабаванняў да мастацтва.

### *Т э м а 18. Літаратуразнаўчыя метады. Асноўныя напрамкі і школы ў літаратуразнаўстве*

Біяграфічны метад. Адбіткі яго ў працах беларускіх вучоных пачатку XX ст.

Найбольш значныя прадстаўнікі міфалагічнай школы – еўрапейскай і айчыннай. «Неаміфолагі». Рытуальна-міфалагічная крытыка ў беларускай навуцы (С.Даніленка).

Культурна-гістарычная школа і ўплыў яе ідэй на беларускую літаратурна-мастацкую крытыку і публіцыстыку канца XIX – пачатку XX ст.

Кампаратывістыка ў XX ст.: асаблівасці развіцця, найбольш буйныя навуковыя цэнтры. Параўнальна-гістарычная метадалогія і сучаснае беларускае літаратуразнаўства.

Узнікненне псіхалагічнага напрамку ў другой палове XIX ст. на аснове дасягненняў псіхалогіі і фізіялогіі. Праяўленне некаторых рыс псіхалагічнага метаду ў працах беларускіх крытыкаў 1920–30-х гг. (М. Піятуховіча, І. Замоціна, А. Бабарэкі, інш).

Фармальны метад і яго сутнасць (Б. Шклоўскі, Р. Якабсан, інш.).

Сацыялагічны метад як прынцып і прыём даследавання. Праяўленне вульгарнага сацыялагізму ў беларускай савецкай літаратурна-тэарэтычнай думцы 1920–30-х гг. (М. Піятуховіч, Л. Бэндэ, А. Кучар, інш.).

Школа «новай крытыкі», яе метадалогія, самыя значныя прадстаўнікі.

Духоўна-гістарычная школа, яе асноўныя метадалагічныя прынцыпы. В. Дыльтэй як заснавальнік духоўна-гістарычнай школы, яго паслядоўнікі.

Структуралізм і яго адносіны да метаду ў савецкім літаратуразнаўстве.

Экзістэнцыялізм, яго філасофская аснова і сутнасць, прадстаўнікі.

Літаратуразнаўчая герменеўтыка, яе метадалогія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Андреев, А. Н.* Теория литературы: личность, произведение, художественное творчество : учеб. пособие : в 2 ч. / А. Н. Андреев. – Минск : БГУ, 2005. – 153 с.

2. *Бароўка, В. Ю.* Тэорыя літаратуры : вучэб. дапам. / В. Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва ВДУ, 2001. – 32 с.

3. *Волков, И. Ф.* Теория литературы : учеб. пособие. – М. : Просвещение : Владос, 1995. – 256 с.

4. *Теория* литературы : учеб. пособие : в 2 т. / под ред. Н. Д. Тамарченко. – М. : Академия, 2004. – 273 с.

5. *Фесенко, Э. Я.* Теория литературы : учеб. пособие / Э. Я. Фесенко. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Едиториал УРСС, 2005. – 334 с.

6. *Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. – 4-е изд. – М. : Высш. шк., 2004. – 398 с.

7. *Яцухна, В. І.* Тэорыя літаратуры : вучэб. дапам. : у 2 ч. / В. І. Яцухна. – Гомель : ГДУ, 2002–2006. – Ч. 1. – 2002. – 147 с.; Ч. 2. – 2006. – 279 с.

8. *Введение* в литературоведение. Литературное произведение: основные понятия и термины / под ред. Л. В. Чернец. – М. : Высш. шк., 2000. – 556 с.

9. *Рагойша В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. П. Рагойша. – Мінск : Бел. энцыкл., 2001. – 383 с.

10. *Хрестоматия* по теории литературы : в 4 ч. / сост. И. В. Егоров, А. С. Смирнов. – Гродно : ГрГУ, 2005. – Ч. 3. – 180 с.

*Дадатковая*

1. *Андраюк, С. А.* Традыцыі і сучаснасць / С. А. Андраюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 256 с.

2. *Бахтин, М. М.* Эпос и роман : сб. / М. Бахтин. – СПб. : Азбука, 2000. – 300 с.

3. *Ветловская, В. Е.* Анализ эпического произведения. Проблемы поэтики / В. Е. Ветловская. – СПб. : Наука, 2002. – 211 с.

4. *Дзюбайла, П. К.* Беларускі раман. Гады 70-я / П. К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Добин, Е.* Сюжет и действительность. Искусство детали / Е. Добин. – М. : Сов. писатель, 1981. – 431 с.

6. *Есин, А. Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения : учеб. пособие. – 7-е изд., испр. / А. Б. Есин. – М. : Флинта : Наука, 2005. – 248 с.

7. *Жураўлёў, В. П.* Структура твора / В. П. Жураўлёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 158 с.

8. *Ідэйна-тэарэтычныя* пытанні сучаснага літаратурнага працэсу. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 237 с.

9. *Каваленка, В. А.* Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 335 с.

10. *Казбярук, У. М.* Рамантычны пошук. Назіранні над беларускім рамантызмам пачатку XX ст. / У. М. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 184 с.

11. *Кременцов, Л. П.* Теория литературы. Чтение как творчество : учеб. пособие / Л. П. Кременцов. – М. : Флинта : Наука, 2003. – 167 с.

12. *Кузнецова, Т. Ф.* Формирование «массовой литературы» и ее социокультурная специфика / Т. Ф. Кузнецова // Массовая культура : учеб. пособие. – М. : Альфа-М ; Инфра-М, 2004. – С. 97–113.

13. *Ленсу, Е. Я.* Замысел. Художественная идея и образный мир литературного произведения : учеб.-метод. пособие / Е. Я. Ленсу. – Минск : Навука и тэхника, 1980. – 98 с.

14. *Матрунёнак, А. П.* Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана / А. П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 302 с.

15. *Мелетинский, Е. М.* Поэтика мифа / Е. М. Мелетинский. – 2-е изд., репр. – М. : Вост. лит. РАН, 1995. – 407 с.

16. *Нефёдов, Н. Т.* История зарубежной критики и литературоведения: учеб. пособие / Н. Т. Нефёдов. – М.: Высш. шк., 1988. – 271 с.

17. *Пяткевіч, А.* Сюжэт. Кампазіцыя. Характар. Аб прозе К. Чорнага / А. Пяткевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 159 с.

18. *Рагойша, В. П.* Гутаркі пра верш / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 95 с.

19. *Рагойша, В. П.* На шляху да Парнаса: давед. маладога літаратара : для ст. шк. узросту / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 157 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*20. Современное зарубежное* литературоведение. Концепции. Школы. Термины: энцикл. справ. – М. : Сов. писатель, 1996. – 234 с.

*21. Стыль* пісьменніка: зб. арт. / рэд. акад. В. В. Барысенка, д-р філал. навук П. К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 447 с.

*22. Тарасюк, Л.* Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры / Л. Тарасюк // Роднае слова. – 2001. – № 4. – С. 5–12.

*23. Шкраба, Р.* Характар. Стыль. Дэталь: літ.-крыт. арт. / Р. Шкраба. – Мінск : Беларусь, 1965. – 259 с.

*24. Шпакоўскі, І. С.* Тыпізацыя ў лірыцы. Формы і сродкі / І. С. Шпакоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 144 с.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі кампетэнцый студэнта

– Вуснае апытанне ў час заняткаў.
– Тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым.
– Выкарыстанне праблемных, творчых задач.
– Аналіз літаратурных з’яў у пісьмовай форме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка)*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01 Беларуская мова і літаратура*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,83. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.